Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

"Przegląd Wileński" Wilno, Uniwersytecka 9-4

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адмініетр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 28 Вільня, Субота 9-га ліпня 1927 г. Год I

Наш абавязак.

У меру таго, як расьце і разьвіваецца беларускі рух, як беларускія працоўныя масы паступова, крок за крокам адваёвываюць сваё найсьвяцейшае права быць гаспадарамі на сваей зямлі, як павялічываецца лічба беларускіх культурных і гаспадарчых установаў, а самаўрады запаўняюцца выбранцамі нашага сялянства й работнікаў, — усё ярчэй і ярчэй выяўляецца патрэба мець адпаведна ўзгадаваныя *інтэлігентныя сілы*, якія-б вялі нашу грамадзкую працу, здаваляючы патрэбы беларускае працоўнае людласьці. І вось перад намі востра ўзьнімаецца пытаньне: скуль і як можам мы знайсьці гэтыя сілы, без якіх мы заўсёды будзем ставацца на ласцы чужое нам і па нацыянальнасьці і па сацыяльнай ідэалёгіі інтэлігенцыі?!

Адказ на гэта дадзены ўжо нашымі адраджэнскімі дзеячамі, якія ў той мамэнт, як толькі гэта сталася магчымым, напружылі свае сілы, каб стварыць *беларускія гімназіі* з роднай выкладовай мовай. Апрача Вільні, такія-ж гімназіі паствары́ліся ў цэлым радзе беларускіх мест і мястэчак Заходняе Беларусі — ў Будславі (зачынена польскай уладай), у Гарадку (гэтак сама), ў Радашкавічах, Навградку, Клецку. І вось ужо восем гадоў з гэтых нашых гімназіяў, з нязвычайна вялікім накладам працы і энэргіі ўтрымліваных нашым грамадзянствам, выходзіць моладзь, падтрыхтаваная да навукі ў вышэйшых школах,—выходзяць нашыя будучыя адвакаты, дактары, аграномы, вучыцялі і г. д.

Праўда, ня вельмі лёгка дастаецца ім магчымасьць вучыцца ў вышэйшых школах. Большая частка іх, пазбаўленая права вучыцца ў унівэрсытэтах Польшчы, выэміґравала заграніцу. Але й нашыя заграмічнікі ўжо пачалі варочацца да краю з унівэрсытэцкімі дыплёмамі ў кішані і станавіцца ў рады актыўных беларускіх працаўнікоў на роднай ніве. Ды навет і тыя, каму не ўдалося прадоўжыць сваё вучэньне пасьля выхаду з гімназіі, вынесьлі з яе ўсё-ж такі не малы запас веды, а галоўнае — *агульнае разьвіцьцё*, якое дае ім магчымасьць лёгка разьбірацца ўва ўсіх справах і пытаньнях нашага грамадзкага жыцьця, ды заняць адпаведнае месца ў грамадзкай працы.

Ужо з гэтага ясна кожнаму, якую вялікую вагу — для беларускае справы наагул, дый для нашых працоўных масаў асабліва — маюць нашы беларускія гімназіі. Яны бароняць нашу моладзь ад дэнацыяналізацыі і разрыву сувязі з „родным карэньнем“, яны захоўваюць для нашых працоўных масаў тую *інтэлігентную сілу*, якую нашы нацыянальныя і сацыяльныя ворагі стараюцца ў нас *вырваць і выкарыстаць, як аружжа проці нас самых.* Дык ня можа быць ніякае спрэчкі аб тым, што беларускія працоўныя масы перадусім зацікаўлены ў далейшым існаваньні і працьвітаньні нашых беларускіх гімназіяў.

Як-жа забясьпечыць быт нашым гімназіям?

Калі-б беларусы былі ўжо запраўды поўнымі гаспадарамі на сваей зямлі—тут, у Заходняй Беларусі (як гэта ёсьць у Усходняй), дык ясна, што справа гімназіяў разьвязвалася-бы вельмі проста: іх утрымліваў-бы дзяржаўны скарб. Аднак, пры тых варунках, якія існуюць для Беларусі пад Польшчай, на гэта спадзявацца немагчыма. Дык *само грамадзянства павінна утрымаць свае гімназіі* — ня гледзячы на тое, якіх цяжкіх ахвяр гэта вымагае.

Але ёсьць магчымасьць аблягчыць цяжар утрыманьня нашых гімназіяў—пры ўчасьці масаў. Трэба, каб *кожын беларус,* які мае магчымасьць і хоча аддаць свайго сына ці дачку ў навуку, пасылаў іх *ня ў чужацкія, а ў свае родныя, беларускія гімназіі.* І калі клясы беларускіх гімназіяў да краёў будуць запоўнены вучнямі, дык і цяжар утрыманьня іх будзе лягчэйшы і пасільны нашаму грамадзянству, і хутчэй выпаўніцца задача беларускіх гімназіяў: хутчэй узгадуецца патрэбная лічба інтэлігентных працаўнікоў, якія ўсё свае жыцьцё будуць служыць ня „чужым багам“, ня ворагам нашага працоўнага народу, а іменна і выключна *нашым працоўным масам вёскі й места.*

Дык, грамадзяне, зразумейце гэта і шліце дзяцей сваіх у родныя беларускія гімназіі: гэтым вы дасьцё сваім сынам і дачкам лепшую будучыну і споўніце свой грамадзкі абавязак.

Як адбываліся выбары самаўрадаў.

У Наваградчыне.

„Кур. Віл.“ падае агульныя весткі аб ходзе выбараў у самаўрады ў межах Наваградзкага ваяводзтва, якія тамака ўжо канчаюцца.

У паасобных гмінах — асабліва ў цэнтральнай часьці ваяводзтва — лічба ўчасьнікаў выбраў дасягала 50 — 70% усяе лічбы жыхароў, запісаных у сьпіскі выбаршчыкаў. Гэтак прымалі ўчасьце ў выбарах блізу ўсе мужчыны (агульная лічба іх складае 45% насяленьня), ды значная частка жанчын. Характэрна, што, чым больш у гміне граматных, тым большы быў процант учасьнікаў у выбарах. Наадварот, у цямнейшых гмінах на выбары сяброў гміннага сабраньня зьяўлялася ледзьве 6 — 8 проц. выбаршчыкаў.

У гмінныя рады праходзілі пераважна сяляне (ясна ж: беларусы). У Слонімскім павеце, да прыкладу, выбрана ў гмінныя рады 66 сялян—(беларусаў), 7 асаднікаў, 3 настаўнікі, 3 абшарнікі і 2 урадоўцы. Гэтак сялянства здабыла больш за 80 проц. усяе лічбы мандатаў, палякі — менш за 20 проц. Тое само было і ў другіх паветах. У Стаўпецкім павеце, дзе ў кожнай гміне паўбіваліся па адным прадстаўнікі ад паноў і настаўнікаў (апрача аднае, дзе іх ня пусьцілі), ды ад асаднікаў, — у дзьвюх гмінах былі выстаўлены і кандыдатуры жанчын. Ці прайшлі яны ў гмінныя рады, „Кур. Віл.“ ня кажа.

За кандыдатаў на радных, як сьцьвярджае польская газэта, выстаўляліся пераважна асобы паважныя, якія цікавяцца грамадзкім жыцьцём. Многа прайшло людзей з сярэдняй, а то і з вышэйшай асьветай.

Старавейская гм., Слонімскага пав.

Гэтак даўно чаканыя перавыбары гмінных радаў на вёсках нарэшце адбываюцца. Калі была толькі распушчана старая струхлеўшая рада, дык падрыхтоўка да новых выбараў вялася так пасьпешна і так таямніча, што сяляне нічагусенькі ня ведалі навет тады, калі былі ўжо павызначваны гмінныя выбарныя камітэты. Але, ня гледзячы на гэта, і ня гледзячы на тое, што п. староста ў камітэты паназначаў сваіх людзей, сярод якіх можна было бачыць і некалькі падлізаў сялян, усё ж ткі сяляне перамаглі, стварыўшы сялянскі блёк усяе гміны і выставіўшы свой сьпісак № 7. Не памаглі панам іхнія абяцанкі, не памаглі іхнія салодкія словы, не памаглі і пагрозы—праваліліся і праваліліся з трэскам. З 95 галасоў сьпісак № 7 атрымаў 61 голас, а рэшта сьпіскаў правалілася, толькі два з іх атрымалі па 7—8 галасоў. На гэты раз не ўдалося панам пад'ехаць на пакорнай сялянскай сьпіне і, здаецца, саўсім ужо ня ўдасца, бо нашы сяляне зразумелі, што толькі ў дружнай, супольнай і салідарнай працы сялянства, наша перамога і наша будучына і што толькі сам працоўны народ здабудзе сабе тыя правы і тыя варункі жыцьця, да якіх ён імкнецца.

Сяр[illegible]іты.

ПОЛЬШЧА і ССРР.

Важныя нарады.

З Масквы прыехаў у Варшаву польскі пасол п. Патэк, які яшчэ ў цягніку, сустрэўшыся з ехаўшым з Вільні марш. Пілсудскім, зрабіў галаве ўраду падробны даклад. Па прыезьдзе марш. Пілсудскага ў Варшаву адбыліся два паседжаньні з учасьцем яго-ж, мін. Залескага і пасла Патка, на якіх абгаварываліся агулам польска-радавыя адносіны і справа ліквідацыі канфлікту на грунце забойства пасла Войкова.

Вынікі нарад не апублікаваны.

Радавае агенцтва аб польска-радавых адносінах.

Радавае агенцтва („ТАСС“) заяўляе, што папсаваныя забойствам Войкова польска-радавыя адносіны ня могуць палепшыцца да атрыманьня Радамі польскага адказу на апошнюю іх ноту. Ад характару гэтага адказу залежыць, ці гэтыя адносіны пагоршацца, ці папрвяцца. Але адных пекных слоў цяпер ужо мала. Вось іншыя балтыцкія дзяржавы, якія стараюцца запраўды захаваць добрыя адносіны з ССРР, прынялі рад запраўдных мераў, каб паралізаваць на сваей тэрыторыі дзеяльнасьць белагвардзейскіх замахоўцаў. А польскі ўрад дагэтуль не зрабіў у гэтым кірунку нічога. Дык усе заявы мін. Залескага аб мірных імкненьнях польскай палітыкі неяк не пацьверджаны адпаведнымі крокамі ды фактамі. Трэба думаць, што ўсе гэтыя (няшкодныя для польска-англійскіх адносінаў!) заявы мелі папросту мэтай супакоіць устрывожаных польска-радавым канфліктам амэрыканскіх банкіраў, ад якіх Польшча спадзяецца атрымаць пазыку. Польскі ўрад павінен ведаць, што публічная апінія ССРР ніколі не адобрыць ніякага паразуменьня свайго ўраду з Польшчай, пакуль ССРР не атрымае поўнага здаваленьня за забойства пасла Войкова. Дык польскі ўрад дарэмна думае, што яму ўдасцца—пасьля забойства Войкова ды суду над яго забойцай—проста перайсьці да чарговых справаў... Ясна з усяго гэтага і тое, што радавы ўрад ня мог, як падалі фальшыва газэты, зрабіць новую прапазыцыю Польшчы ў справе гаранцыйнага трактату. — На перашкодзе новым перагаворам стаіць усё тая-ж незьліквідаваная справа Войкова... — Радавы ўрад усьцяж чакае адказу на сваю апошнюю ноту.

Чычэрын і справа польска-радавых адносінаў.

Газэты пішуць, што прыезд Чычэрына неяк скрануў з мёртвага пункту справу польска-радавых адносінаў, папсаваных пасьля забойства Войкова.

Чычэрын быццам меў доўгую нараду з польскім паслом п. Паткам, пасьля чаго п. Патэк паехаў у Варшаву, дзе зразу-ж быў прыняты марш. Пілсудскім. Пішуць, быццам Чычэрын хоча аблягчыць польскаму ўраду вострыя варункі, пастаўленыя Літвінавым, і тым прысьпяшыць заключэньне гаранцыйнага трактату...

Ці Чычэрын верыць асабіста ў шчырыя жаданьні польскага ўраду падпісаць з Радамі гэты... „проці-англійскі“ трактат, ці робіць від, што верыць, ня ведама.. Трэба думаць, што ў кожным разе да падпісаньня трактату цяпер можа яшчэ далей, як у 1925 г., калі Чычэрын быў так горача спатыканы ў Варшаве.

Цікаўныя заявы Чычэрына.

У радавых газэтах надрукавана цікаўная гутарка Чычэрына з англійскімі карэспандэнтамі. Чычэрын заявіў ім яшчэ раз, што радавы ўрад і III Інтэрнацыянал—зусім розныя рэчы. Радавы ўрад дае толькі Комінтэрну вольны прытулак у Маскве, як, напрыклад, галяндзкі ўрад—II Інтэрнацыяналу ў Амстэрдаме...

Радавы ўрад зусім не вядзе ніякай прапаганды заграніцай, у чым вінаваціць яго англійскі ўрад. Далей Чычэрын заявіў, што разрыў з Англіяй зусім ня спыніў, але, наадварот, толькі разьвіў гандаль ССРР з іншымі краямі. Дык страты—не на баку ССРР. Чычэрын заявіў, што вялікая небясьпека пагражае эўропэйскаму міру дзеля таго, што англійскія рэакцыянеры нацкоўваюць Польшчу на ССРР. Францыя настроена больш мірна, але яна ўжо ня мае былое магутнасьці. Паміж Польшчай і ССРР няма невырашымых для ўзаемнай добрай волі справаў, і Польшча павінна шчыра выявіць гэтую добрую волю, ня слухаючы фатальных падшэптаў Англіі.

Шпіёнскі працэс у Менску.

„За Свабоду“ даносіць аб шпіёнскім працэсе ў Менску. Суд разглядаў справу 9 асоб, абвінавачаных у шпіёнстве на карысьць Польшчы. Галоўны падсудны нейкі Савіцкі Язэп засуджаны на расстрэл. 6 асоб засуджаны ў вастрог, 2 апраўданы.

Расстрэл полькі ў Харкаве.

Радавае Агенцтва даносіць:

Алена Вішнеўская, польская шпіёнка, якая прымала чыннае ўчасьце ў польскай ваеннай разьведцы і арганізоўвала сыстэматычна пераезды ў Польшчу эміґрантаў — контр-рэвалюцыянераў, прысудам Харкаўскага Акружнога Суда прыгаворана на расстрэл. Прысуд выкананы.

У Сойме.

Самаўрадавыя законы на пленуме Сойму.

1-га ліпня адбылося паседжаньне Сойму, на якім пачаўся разгляд самаўрадавых законаў.

Як ведама, праекты гэтых законаў апрацаваны яшчэ ў 1923 годзе ўрадам хіена-пяста, але былі з такім абурэньнем спатканы навет польскай радыкальнай прэсай, што ўрад паноў вітасаў ды кернікаў не пасьмеў навет падаць іх Сойму. Толькі ў 1924 годзе ў лютым месяцы яны, крыху падчышчаныя, былі ўнесены ў Сойм міністрам унутраных спраў ураду Грабскага п. Солтанам; дый той, уносячы іх, пры гэтым напісаў афіцыяльна, што ані ягоны ўрад, ані ён асабіста... ня будзе падтрымліваць гэткіх—„за пшэпрошэнем“—„законапраектаў“.

Аднак-жа, як сцьвярдзіў на паседжаньні Сойму дакладчык п. Путэк (Вызваленьне), соймавая камісія гэтыя солтанавыя „законапраекты“ прыняла за падставу дзеля сваей працы над стварэньнем нормаў для самаўрадаў у Польскай Рэспубліцы.

Мы ня маем яшчэ ў руках дакладнага тэксту апрацаваных соймавай камісіяй праектаў, дык дамо толькі агульнае паняцьце аб іх—паводле слоў дакладчыка п. Путка.

Праекты не зьмяняюць істнуючых граніцаў гмінаў, але, нажаль, даюць неабмяжаванае права краіць ды перакраіваць іх — адміністрацыйнай уладзе. Урад мае паўнамоцтвы злучаць гміны, касаваць тыя, якія „зьяўляюцца карыкатурай, ня будучы ў стане споўняць сваіх заданьняў“. Урад можа ствараць новыя гміны. Законапраект аб вясковай гміне стаіць на грунце „адна-вясковай гміны“, якая істнуе у прускім і аўстрыяцкім заборах“. Гэта не выключае істнаваньня гмінаў, зложаных з некалькіх драбнейшых вёсак. Нашыя вялікія гміны маюць быць пабіты на драбнейшыя—пераважна адно-вясковыя. Гэткім чынам прадбачаная ў першым праекце „грамада“, як асноўная ячэйка вясковага самаўраду, перастае істнаваць. Ці-ж гэта дзеля таго, каб зусім вывесьці з памяці сялянства на ўсходзе навет самае слова „грамада“, што так настрашыла паноў „прыраджоных“ у Варшаве?! „Грамада“ мае ўсюды зьліцца з гмінай, а калі дзе гэтага ня будзе, дык „грамада“ мае назвацца ўжо не „грамадой“, але... „солэцтвам“, з „солтысам“ на чале, які зьяўляецца сталым дэлегатам гэтага „солэцтва“, папросту вёскі,—у гміннай радзе.

Гмінныя ўлады складаюцца з Гміннай Управы з войтам на чале і Гміннай Рады, якая робіць пастановы і кантралюе Управу. Усю выканаўчую ўладу ў гміне папраўдзе мае ня ўправа, але толькі войт, бо-ж паны лаўнікі зьяўляюцца, па праекту, толькі памоцнікамі войта, дый могуць рабіць толькі тое, што ім загадае войт. Гэтыя лаўнікі маюць самастойны голас толькі тады, калі выступаюць, як сябры „Гміннага Сэнату“ — у справах судова-паліцэйскіх. „Гмінны Сэнат“— пекна, няма што казаць: паны палякі як-ніяк — мастакі на розныя пышныя ды гучныя назовы! А прасьцей, дык гэта будзе—стары, даўно ведамы сялянству „валасны суд“, які мала-што ня будзе памагаць паном паліцыянтам... лавіць „камуністаў“, ды наагул—заводзіць добры ды „правамысьльны“ лад на „крэсах“.

„Уводзячы гэткі адно-асабовы Гмінны Урад, камісія хацела забясьпечыць спраўнасьць, а перадусім шпаркасьць гміннай улады ў яе дзеяльнасьці“.

Праўда, справы важнейшыя, асабліва зьвязаныя з пэўнымі абавязкамі грашовымі

ды наагул прыватна-праўнымі для гміны, павінны быць прыняты Гміннай Радай ды зацьверджаны павятовай Управай.

Войт старшынствуе на паседжаньнях Рады, дый, хаця не галасуе, але... падае голас у выпадках роўнасьці галасоў: тады яго голас пераважае. Войт, выконываючы пастанову гміннай рады, мае права прыпыніць гэтае выкананьне, калі ён асабіста... лічыць пастанову ня толькі нязгоднай з істнуючым законам, але і—шкоднай для інтарэсаў гміны. Тады справа ідзе на вырашэньне ў павятовую Управу. Гміна Рада можа распачаць дысцыплінарную (ўнутрана-судовую) справу проці войта за яго надужыцьці—перад павятовай Управай. Але самой Радзе дакладчык вельмі баіцца даць права судзіць свайго войта: гэта вытварыла б поўную анархію ў гміне.

Арт. 100, які робіць абавязкава для войта ўменьне чытаць ды пісаць папольску, камісія ўтрымала ня гледзячы на рашучыя пратэсты паслоў меншасьцяў.

Мова ўрадаваньня ў гмінных самаўрадах азначаецца так званымі „языковымі“ законамі 31-га ліпня 1925 г.; гэта значыць, што дапускаецца ўжываньне—побач з польскай—і беларускай мовы. „Аднак-жа Гміная Рада навет у ўсходніх ваяводзтвах павінна ведаць польскую мову“ — кажа даклдчык. Што гэта значыць, ды як гэтае дамаганьне будзе фармулявана ў законе, гэта — вельмі цікаўна. Бо-ж толькі-што дакладчык сьцьвярдзіў, што адзін войт абязаны ведаць польскую мову.

Гмінная Рада выбірае войтаў. Рады складаюцца з радных, якіх можа быць — ад 4 да 40. Гмінная Рада мае правы мяйсцовага законадаўства, мае пэўныя паліцэйскія правы, прычым яе (зн. зап.) паліцэйскім органам зьяўляецца войт.

Найбольш важным для меншасьцяў зьяўляецца аддзел самаўрадавых законаў, які кажа аб выбарных правох у самаўрады. Бо тутака якраз папярэднія праекты ўводзілі такія рэчы, як... прызнаньне па 3—4 галасы паляком на „крэсах“ і г. д. Сам дакладчык кажа, што ў гэтай справе дайшло да пэўнага кампрамісу. Урачыста абвешчана, што выбары ў самаўрады будуць рабіцца паводле так-званай „4 хвосткі“ — агульным, роўным, тайным, простым і прапарцыянальным галасаваньнем. Камісія аднак-жа,—кажа даклад чык, — лічылася як з роўнымі разьмерамі гмінаў, таксама і з іх розным нацыянальным складам, а датаго-ж і — з... палітычнымі настроямі насяленьня, якія выявіліся пры выбарах у самаўрады (чытай: з узростам тakзван. „камунізму“!). Дзеля таго камісія прапануе тры розныя сыстэмы выбараў—для розных частак Дзяржавы.

Якія-ж гэтыя тры розныя спосабы?

У Польшчы прускага „забору“ камісія пакінула той парадак, які істнуе; у цэнтральнай Польшчы, дый у кракаўскім ваяводзтве—галасаваньне мае адбывацца не па сьпіскам, але на прозьвішчы азначаных асобаў. А для ўсходніх ваяводзтваў, дый 2 (чыста беларускіх!) паветаў Беластоцкага ваяв. камісія прапануе прапарцыянальнае галасаваньне па сьпіскам. Гэта — каб „забясьпечыць правы меншасьцяў“—ведама ж: польскіх! — на „крэсах“. „Апрача таго, — глуха кажа дакладчык, — камісія апрацавала нейкія „спосабы, каб перашкодзіць залішняму палітыкаваньню ды небясьпечнай нацыянальнай барацьбе ў гэтых ваяводзтвах“. Цікаўна даведацца ясьней: якія гэта „спосабы“?!

Кажучы далей аб наглядзе з боку адміністрацыі над самаўрадамі, дакладчык божыцца, што законапраекты забясьпечываюць поўную самастойнасьць самаўрадаў, ды незалежнасьць іх ад выканаўчай дзяржаўнай улады. Але тут-жа дадае, што, апрача агульнага нагляду, мае істнаваць яшчэ нейкі „сьцiслы службовы кантроль над самаўрадамі з боку... п. п. старостаў і ваяводаў“, як бліжэйшага „начальства“ над самаўрадамі. „Асабліва староста — на тэрыторыях уздоўж граніцы—мае права касаваць выбары войтаў—з увагі на ведамыя імкненьні нашых суседзяў“.

Як ведама, старыя кернікавыя праекты зусім ясна зшывалі ў адно цэлае, самаўрады з урадамі п. старосты, творучы нейкія „адміністрацыйныя самаўрады“, дзе староста, як адначасна і старшыня павятовага самаўраду і ўрадовец мін. унутраных спраў, рабіў, што хацеў. Як вырашаюць гэтую справу, найважнейшую для запраўднай самастойнасьці самаўрадаў, новыя праекты,—ці яны разьдзяляюць самаўрады ад адміністрацыі, пазбаўляючы старостаў фактычнай улады над самаўрадамі, — аб гэтым дакладчык не сказаў нічога.

Англійская буржуазная прэса—аб меншасьцях у Польшчы.

Карэспандэнт лёндаскай газэты „Таймс“ (Час), органу буйнай буржуазіі ды паў-афіцыёз кансэрватыўнага ўраду, апісывае, што ён „бачыў“ у часе сваей нядаўнай падарожы па „крэсах усходніх“.

Мы памятаем, што гэты панок, бышы ў Вільні, навет не пацікавіўся зайсьці ў паважныя беларускія ўстановы, каб паглядзець, як там жывуць ды працуюць, дый—паінфармавацца там з запраўды-ж пэўных крыніц, як „жывецца меншасьцям пад Польшчай“. З таго, што ён піша, адразу можна зразумець, дзе і ў каго атрымліваў гэтыя свае „інфармацыі“ высланец англійскай рэакцыйнай буржуазіі ў блізкую ей цяпер Польшчу...

„Трэба папросту захапляцца годнай зьдзіўленьня працы, якой польскі жаўнер-пагранічнік адбудаваў бясьпечнасьць жыцьця і маемасьці на „ўсходніх крэсах“ Польшчы... Гэтая бясьпечнасьць на „крэсах“ навет большая, як... у цэнтральных часьцях Польшчы“...

„Яшчэ тры гады назад гэтая польска-радавая граніца была найбольш небясьпечная, найбольш адкрытая з усей Эўропы, а цяпер яна—адна з найшчыльней бароненых. **Адносіны жаўнераў з мясцовым сялянствам уладжыліся зусім добра**“...

Пэўна-ж гэты панок не пацікавіўся тымі пудамі інтэрпэляцыяў беларускіх клюбаў, якія сабраны ў Сойме за гэтыя 3 гады... Але ў канцы і ён ня мог не сьцвярдзіць, што — „на няшчасьце, ня зроблена роўнай папраўы ў адміністрацыі краю: крыўды языковыя ды школьныя выклікаюць нездаваленьне насяленьня, а датаго-ж і гаспадарчая руіна краю—паўсюдная“...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Чаму не назначаюць заступніка Войкову.

Як можна думаць, радавы ўрад даўно выбраў заступніка забітага пасла ў Варшаве, але не назначае яго з прычынаў чыста тактычных. Аб гэтым даволі ясна казалі заявы радавых дыпляматаў пасьля забойства. Радавы ўрад чакае адказу на сваю другую ноту і выясьненьня справы перагавораў аб гарантыйным трактаце. А пакуль з польскага боку няма выразнай пазыцыі ў гэтых справах, радавы ўрад лічыць, што найбольш адпаведна гэтую нявыразнасьць... выразіць у „тымчасовасьці“ свайго дыпляматычнага прадстаўніцтва ў Варшаве, дый у абмяжаванасьці яго паўнамоцтваў...

Орган Англійскіх банкіраў аб польскай пазыцы.

Орган англійскіх банкіраў „Фінансавыя Навіны“ ў артыкуле аб польскай пазыцы піша, што добры „псіхалягічны мамэнт для польскай пазыкі“ ў сучасны мамэнт мінуў... Агульны настрой для заграпічных пазыкаў на амэрыканскім рынку—страшэнна дрэнны. Газэта востра крытыкуе пазыковыя спосабы амэрыканскіх банкіраў, пацяшаючы Польшчу надзеяй на тое, што можа ў восені біржавыя настроі будуць лепшыя...

Англійскія банкіры маглі-б—замест крытыкі амэрыканскіх—даць самі пазыку Польшчы...—Аднак-жа гэтага ня робяць. Відаць, „псыхалягічны мамэнт“ мінаваў і для Англіі—пасьля разгрому „камуністаў“ у Кітаі, а новы—яшчэ не надыйшоў...

Неспадзяваны выбар прэзыдэнта места Варшавы.

Выбары прэзыдэнта места Варшавы (галавы магістрату) далі зусім неспадзяваныя вынікі. Аказалася, што так-званыя „санатары“ (ўрадавая група радных) згаварыліся з раднымі эндэкамі проці сяцыялістаў і падалі свае галасы **за эндэцкага кандыдата**, праваліўшы гэтак кандыдата сацыялістаў.

Гэты неспадзяваны вынік выбараў выклікаў цэлую буру. Справа ў тым, што ў часе выбарнае кампаніі ў Варшаве „санатары“ йшлі разам з сацыялістамі, каб вызваліць сталіцу ад эндэцкага панаваньня. Аднак, у самай радзе „санатары“ падтрымалі эндэкаў,—відаць, убаяўшыся яшчэ больш прыкрага для ўраду панаваньня сацыялістаў!

„Вызваленцы“ іграюць у апазыцыю.

У № 26 „Вызваленьня“ зьмешчаны артыкул нейкага Лянгера, з якога (сьледам за „Роботнікам“) падаем гэткае характэрнае месца аб урадзе марш. Пілсудскага:

„... то ён гладзіць манархістаў, то ізноў кланяецца каталіцкаму кліру, дый навет — ніжэй, чым гэтага-б хацеў сам гэны клір. То кідае грошы нанятым „журналістам“, каб плявалі на Сойм, на партыі, то ізноў высылаюцца банды агітатараў, каб закладалі... новыя партыі „чэсных санатараў“, „напраўцаў“, „запраўдных працоўных інтэлігентаў“ і г. д. То ізноў валіць у сацыялістаў, а навет хацелася-б яму крэпка сьцебануць вызваленцаў—за тое, што яны—„залішне партыйныя“, а дзеля таго даецца розным паслом... сялянскім „дапамога“, каб яны—разьбівалі сялянскую сілу ў краі... Але воля сялянства—іншая. Народ добра ўмее адрозьніць фальш ад праўды, маральнасьць ад прадажнасьці... Трэба-б вам, панове, крыху больш скромнасьці дый запраўднага дбаньня аб дабро дэмакратычнай Польшчы. Бо памятайце, што сваімі хістаньнямі, сваей беспраграмнасьцяй вы толькі павялічываеце сілы рэакцыі ды камунізму... Дык годзе ўжо гэтай забавы—пустога самахвальства, эгаізму і заразумеласьці, калі йдзе аб дэмакратычную Польшчу“..

Так пачаў пісаць афіцыяльны орган аднэй з трох урадавых групаў у Сойме...

66 дэкрэтаў...

4 ліпня ўрад унёс у Сойм аж 66 выданых за апошні час дэкрэтаў, у тым ліку і дэкрэт прэсавы.

Заграніцай.

Пакушэньне на ГПУ ў Маскве.

Уноч з 2 на 3 чэрвеня агенты ГПУ ў Маскве выкрылі рыхтаваны замах на галоўны гмах ГПУ, які меў быць узарваны дынамітам. Сьледзтва выкрыла, што замах гатавалі тры асобы, якія перайшлі цераз граніцу з Фінляндыі. Замах быў арганізаваны манархічнай арганізацыяй. Калі замахоўцы ўцяклі з Масквы пасьля няўдачы, за імі была наладжана пагоня. Пры арышце яны далі аружны адпор і пасьля перастрэлкі былі забіты. Прозьвішчы іх — Обэрпут, Захарэвіч і Вознесенскій.

„Тыдзень абароны“ ў ССРР.

У „Работніцкай Газэце“ надрукавана заява Рыкава аб тым, што 10 ліпня распачнецца „тыдзень абароны“, які будзе адказам работніцка-сялянскага Саюзу на правакацыю з боку Англіі. Кожны работнік, піша Рыков, павінен умець уладаць аружжам. Трэба змабілізаваць усе сілы дзеля падтрыманьня чырвонай арміі і флёту. У гэтым — першы крок вялікае гістарычнай задачы працоўных...

Бухарын — аб тактыцы заходніх сацыялістаў.

На партыйным зборы ў Маскве Бухарын сказаў прамову аб выніках апошняй сэсіі Рады Лігі, у часе якой адбылася канфэрэнцыя міністраў заходняй буржуазіі ў справе процірадавага фронту. „Адначасна з агульным націскам на нас з боку буржуазіі, сацыял-згоднікі таксама шырокім фронтам далучыліся да гэтага выступленьня. Дый у хуткім часе трэба спадзявацца новага націску на заграпічныя камуністычныя партыі, дый розных махінацыяў сацыялістаў—у мэтах ізаляцыі (адасобненьня) шырокіх пралетарскіх масаў Эўропы ад камуністычнага рэвалюцыйнага авангарду“.

Калёніі для Нямеччыны.

„Мандатная камісія“ Лігі Народаў прыняла рэзалюцыю аб тым, каб павялічыць свой склад яшчэ адным сябрам—немцам.

Гэтая пастанова мае, ці лепш — можа мець вялікія пасьледзтвы. Нямеччына цяпер ня мае ніводнай калёніі — ані ўласнай, ані так-званай „мандатнай“ (як Эгіпэт, аддадзены Лігай—па мандату—Англіі, ці як Сірыя—Францыі). Гэта рабіла з Нямеччыны шчырага абаронцу ўціскавых калёніяў і наагул народаў, якія вызваляюцца с пад жалезнага бота імпэрыялістычных дзяржаваў... Буржуазная

Нямеччына, праўду кажучы, мае „амбіцыю“ стацца вялікай каляніяльнай дзяржавай, а перадусім дамагаецца, каб ёй вярнулі адабраныя ў яе даваенныя калёніі. Дзяржавы—пераможцы, якіх асабліва б'юць цяпер у іх калёніях ды паў-калёніях, зразумелі ўрэшце, якую небясьпеку мае для іх улады ў калёніях адступнасьць нямецкага „таварыша“—імпэрыяліста... Дык вось выражэньнем гэтага зразуменьня, за якім пойдуць пэўна-ж адпаведныя ўчынкі, і зьяўляецца пастанова мандатнай камісіі Лігі Народаў. Нямеччына пэўна ж атрымае той ці іншы „мандат“, на якую найменш патрэбную вялікім каляніяльным дзяржавам калёнію.

Гэткім чынам сусьветны імпэрыялізм адным ударам заб'е адразу 2 зайцаў: ня толькі скасуе ў асобе буржуазнай Нямеччыны свайго ворага, але і здабудзе найбольш лоўкага таварыша й памоцніка ў вялікай „працы“ — задушэньня вызвольнага руху „каляровых“ народаў сьвету... Дык першым крокам гэтага павароту нямецкай буржуазіі—ясна-ж мае быць, па англійскай думцы, разрыў яе з Радамі...

Як бачым, усё ідзе адно к аднаму... Ці-ж пойдзе так гладка й да канца, як гэта праектуе англійская рэакцыйная буржуазія, гэта—іншая рэч.

Мытная вайна — замест „духу Лёкарно“.

Французская прэса, а перадусім „гаспадарчыя колы“ Францыі—страшэнна „зьдзіўлены, абураны ды засмучаны“ неспадзяваным апорам нямецкага ураду, які не супыніўся перад разрывам тарговых перагавораў ды абвясьціў Францыі фармальную мытную вайну. Ад 1 ліпня ўсе французскія тавары ў Нямеччыне падлягаюць найвялікшым „абаронным“, ды навет „забаронным“ мытам. Некаторыя тавары зусім недапушчаны ў Нямеччыну...

Вось яшчэ далейшыя рэзультаты таго „перагляду лёкарнскай палітыкі Брыяна“, які распачаў мудры дыплямат п. Пуанкарэ...

І. Эрэнбург.

13 люлек.

(Пераклаў М. Шыла).

Франсуа д'Эманьян ведаў, што ён гаварыў. На наступную раніцу жаўнеры ягонага палку дасталі загад заняць форт сьв. Вінцэнта. Луі Ру з двума ацалеўшымі кашульнікамі страляў у жаўнераў. Тады Франсуа д' Эманьян загадаў вывесіць белы сьцяг; і Луі-Ру, які чуў аб тым, што белы сьцяг азначае мір, спыніў страляніу. Ен падумаў, што жаўнеры пашкадавалі найпрыгажэйшы з гарадоў і, нарэшце, хочуць памірыцца з Парыжскаю Камунаю. Тры кашульнікі, усьміхаючыся і курачы люлькі, чакалі жаўнераў, а маленькі Поль, у якога ня было больш мыла, каб пускаць паўхіры, насьлядуючы бацьку, усё-ж трымаў у роце люльку і таксама ўсьміхаўся. А калі жаўнеры падыйшлі ўсутыч да форту сьв. Вінцэнта, Франсуа д'Эманьян загадаў траім з іх, лепшым стральцом Горнае Савойі, забіць трох бунтаўшчыкоў. Маленькага камунара ён хацеў узяць жыўцом, каб паказаць сваей заручніцы.

Горцы Савойі ўмелі страляць, — і ўвайшоўшы нарэшце ў форт сьв. Вінцэнта, жаўнеры ўбачылі трох людзей з люлькамі, ляжачымі каля гарматы. Салдаты бачылі шмат забітых людзей і ня зьдзівіліся. Але, убачыўшы на гармаце маленькага хлопчыка з люлькаю, яны зьдзеціналіся і ўспамянулі—адны сьв. Ісуса, другія тысячу чарцей.

— Ты адкуль узяўся, плюгавы клоп? — спытаўся адзін з савойцаў.

— Я праўдзівы камунар,—усьміхаючыся адказаў Поль-Ру.

Жаўнеры хацелі прыкалоць яго штыкамі, але капрал сказаў, што капітан Франсуа д'Эманьян загадаў даставіць маленькага камунара ў адзін з адзінаццацёх пунктаў, куды зганялі ўзятых у палон.

— Колькі ён нашых забіў, гэткі ангялочак! — бурчэлі жаўнеры, падпіхаючы Поля прыкладамі. А маленькі Поль, які ніколі не забіваў, а толькі пускаў з люлькі мыльныя паўхіры, не разумеў, завошта гэтыя людзі лаюць і крыўдзяць яго.

Палоньніка-паўстанца Луі-Ру, якому было чатыры гады ад ураджэньня, жаўнеры нацыянальнае арміі павялі ў заваёваны Парыж. Яшчэ ў паўночных прадмесьцях адстрэліваліся, гінучы, кашульнікі, а ў кварталах Ялісейскіх Палёў, Опэры і ў новым квартале сямёхкоснае Зоркі людзі ўжо весяліліся. Быў найлепшы месяц — травень, цьвілі кашталы шырокіх бульвараў, а над імі, навокал мармуровых столікаў кавярняў, франты пілі рубінавыя настойкі і кабеты нядбайна ўсьміхаліся. Калі міма іх праводзілі малюсенькага камунара, яны крычалі, каб ім выдалі яго. Але капрал памятаў загад капітана і аховываў Поля. Затое ім аддавалі іншых палоньнікаў — мужчын і кабет. Яны плявалі на іх, білі іх дыстынктоўнымі кіёчкамі, а пасьля, замораных, закалывалі штыком, узятым дзеля гэтага ў якога-небудзь прахозіўшага міма жаўнера.

Поля Ру прывялі ў Люксэмбурскі Сад. Там, перад палацам, была адгароджана вялікая дзялянка, куды заганялі палонных бунтаўшчыкоў. Поль з сваею люлькаю важна хадзіў паміж імі і, хочучы пацешыць іншых кабет, якія горка плакалі, гаварыў:

— Я ўмею пускаць мыльныя паўхіры. Мой татка Луі-Ру курыў люльку і страляў з гарматы. Я—праўдзівы камунар.

Але кабеты, у якіх гдзесь на прадмесьці сьв. Антона асталіся дзеці, мо' таксама любіўшыя пускаць паўхіры, слухаючы Поля, яшчэ горай плакалі.

Тады Поль сеў на траву і пачаў думаць а паўхірах: якія яны былі прыгожыя — блакітныя, ружовыя, лілёвыя. А дзеля таго, што ён доўга думаць ня мог, і дзеля таго, што дарога з форту сьв. Вінцэнта да Люксэмбурскага Саду была даўгая і трудная, Поль скора заснуў, не выпускаючы з рук свае люлькі.

Пакуль ён спаў, два рысакі везьлі па Вэрсальскай шашы лёгкае ляндо. Гэта Франсуа д'Эваньян вёз сваю заручніцу Габрыэлю дэ Банівэт у прыгожы Парыж. І ніколі Габрыэля дэ-Банівэт ня была такая харошая, як у гэты дзень. Тонкя акруглёнасьць яе твару напамінала партрэты старадаўных флёрэнтыйскіх мастакоў. На ёй быў касьцюм цытрыновага колеру з карункамі, зробленымі ў манастыры Мэльхэрына. Малюсенькі парасолік аховываў яе матавую скурку, колеру ляпёсткаў яблыні ад простых косаў траўнёвага сонца. Зпраўды, яна была найхарашэйшай жанчынай Парыжу, і ведаючы гэта, яна нядбайна ўсьміхалася.

Уехаўшы ў горад, Франсуа д'Эманьян паклікаў напатканага жаўнера свайго палка і спытаўся ў яго, дзе зьмешчаны палоньнік з форту сьв. Вінцэнта. Калі-ж закаханыя ўвайшлі ў Люксэмбурскі Сад і пабачылі старыя каштаны ў цьвеце, плючш над фантанам Мэдычы і чэрных драздоў, што скакалі па дарожках,—сэрца Габрыэлі дэ-Банівэт перапоўнілася пяшчотаю, і, сьціскаючы руку жаніха, яна прашаптала:

— Мой мілы, як прыемна жыць!..

Палонныя, з лічбы якіх кожную гадзіну каго-небудзь выводзілі на расстрэл, спаткалі галуны капітана з жахам: кожны думаў, што настаў яго чарод. Але Франсуа д'Эманьян не зьвярнуў на іх увагі, ён шукаў маленькага камунара. Знайшоўшы яго сьпячым, ён лёгкім штуршком разбудзіў яго. Хлопчык, прачнуўшыся, спачатку расплакаўся, але потым, убачыўшы вясёлае аблічча Габрыэлі, непадобнае да маркотных твараў іншых кабет,—што акружалі яго, — узяў у рот сваю люльку, усьміхнуўся і сказаў:

— Я—праўдзівы камунар.

Габрыэля, здаволеная, прагаварыла:

— Сапраўды, такі маленькі! Я думаю, што яны родзяцца забойцамі, і трэба цяпер зьнішчыць усіх, навет толькі-што народжаных.

— Цяпер ты паглядзела, і можна яго прыкончыць, — сказаў Франсуа і паклікаў жаўнера.

Але Габрыэля папрасіла яго крыху пачакаць. Ей хацелася працягнуць усалоду гэтага лёгкага і нядбайнага дня. Яна ўспомніла, што, спацыруючы адзін раз у часе кірмашу ў Булонскім Лесе, бачыла барак з падвешанымі глінянымі люлькамі; некаторыя з іх шпарка круціліся. Маладыя людзі стралялі з стрэльбаў у гліняныя люлькі. Хаця Габрыэля дэ-Банівэт была з добрага шляхоцкага роду, яна любіла проста-народныя гульні і дзеля таго, усомніўшы аб кірмашовай забаве, папрасіла жаніха:

— Я хачу навучыцца страляць. Жонка баявога афіцэра нацыянальнае арміі павінна ўмець трымаць у руках стрэльбу. Дазволь

Фош — у Англіі.

Ведамы францускі генарал, галава францускіх мілітарыстаў, сядзіць ужо некалькі дзён у Англіі, куды паехаў асабіста атрымаць прызнаны яму слаўным Оксфордзкім унівэрсытэтам дыплём пачэснага „доктара праў“... Але, атрымаўшы гэты дыплём, гэты „доктар праў“ пасьпяшыў у Лёндан, дзе усьцяж вядзе тайныя гутаркі з англійскім ваенным міністрам...

Англійская — асабліва ўрадавая прэса горача вітае Фоша. Аб чым гутараць англійскія генаралы з францускім, лёгка дагадацца...

Італьянскія фашысты ізноў правакуюць канфлікт з Францыяй.

У часе вялікіх манэўраў італьянскай арміі—чамусьці на самай францускай граніцы — італьянскія ваенныя ўлады, кіруючыя манэўрамі, змусілі жыхараў прыгранічных францускіх вёсак высяліцца на час манэўраў з сваіх сядзібаў.. Некалькі гарматніх стрэлаў трапілі ў гэтыя вёскі... Правакацыйныя здарэньні выклікалі страшэннае абурэньне ў францускай прэсе. Францускі ўрад заявіў рэзкі пратэст.

„Аканчальнае“ зьліквідаваньне альбанска-югаслаўскага канфлікту.

Урадовец югаслаўскага пасольства ў Тыране Дзюрашковіч нарэшце выпушчаны альбанскім урадам з вастрогу. Адначасна югаслаўскі ўрад аддаў альбанскаму ноту, выражаючы свае здаволеньне ды „біручы назад“ рэзкія выражэньні ў папярэдняй ноце... Дык мо' і можна лічыць канфлікт „зьліквідаваным канчаткова“—да новага, аб якім пэўна-ж пастараецца італьянская дыпляматыя!

Спыненьне ваеннага кантролю саюзьнікаў над Баўгарыяй.

1 ліпня скончыўся тэрмін, на які Трактат (падпісаны ў Нэйі ў 1919 г.) аддаў Баўгарыю пад кантроль саюзьнікаў — ваенны і ўсялякі. У сувязі з гэтым у Баўгарыі кантрольная камісія толькі што апошні раз зрабіла агляд справаў, каб сьцьвярдзіць урачыста, што Баўгарыя споўніла сумленна і дакладна ўсе вайсковыя абавязкі, узложаныя на яе Трактатам. Гэта ўсё і сьцьвярдзіў у сваей гутарцы з журналістамі старшыня камісіі палк. Рэнк, які ў хуткім часе выяжджае з камісіяй з Баўгарыі. Ад 1 ліпня ваенны кантроль над Баўгарыяй, як і над іншымі „пераможанымі“ краямі, належыць выключна да Лігі Народаў.

Англійска-эгіпецкая канфэрэнцыя ў Лёндане.

Эгіпецкі кароль (прасьцей: англійскі найміт) Фуад, разам з прэм'ерам эгіпецкага ўраду Сарватам-пашой, ды з штатам спэцыялістаў прыехалі ў Лёндан—на канфэрэнцыю, якую наладзіў Чэмбэрлен.

Каб зрабіць больш „мягкімі“ эгіпецкіх сяброў канфэрэнцыі, англійскія ўлады пусьцілі ў ход усе спосабы. Дэлегацыя Эгіпту была нячувана пышна прынята ў Лёндане англійскім каралём і ўрадам.

Канфэрэнцыя мае на мэце дайсьці да паразуменьня ў 2 найважнейшых для Англіі справах: дабіцца выключнага панаваньня Англіі над ваеннымі сіламі Эгіпту, ці — як дэлікатна тлумачыў Чэмбэрлен: „забясьпечыць абарону краю супольнымі сіламі ад усялякай небясьпекі звонку“, і—„узгодніць“ справу барацьбы — ну, ведама ж, з „камуністамі“, ці забясьпечыць абарону проці небясьпекі ўнутранай...

Ня цяжка зусім зьвязаць абедзьве справы ў адну—справу забясьпечаньня англійскага панаваньня ў Эгіпце! Бо-ж запраўды: якая можа быць „вонкавая небясьпека“ для Эгіпту, апрача нападаў з боку... Англіі, чым толькі-што адкрыта пагражаў англійскі ўрад —у часе апошняга вострага канфлікту, які цяпер мае быць „зьліквідаваны“ ў Лёндане на канфэрэнцыі. Што-ж датычыць „камунізму“, дык мы, беларусы, ня горш за эгіпцян ведаем, што на ўсім сьвеце цяпер імпэрыялістычныя ўрады называюць „камуністамі“, якраз барацьбітаў за нацыянальнае вызваленьне паняволеных народаў... Дык ясна, што лёнданская канфэрэнцыя хоча змусіць урад „незалежнай эгіпецкай дзяржавы“ (незалежнасьць Эгіпту прызнана Англіяй у 1922 г.), каб душыў ды садзіў у вастрогі якраз тых найбольш сільных і энэргічных грамадзян краю, якія, стоючы цьвёрда—з аднаго боку—на груньце ясных жаданьняў дасьпеўшага да незалежнасьці народу, а з другога боку—на груньце міжнародна-прызнанай канстытуцыі Незалежнай Эгіпецкай Дзяржавы, — хочуць зрэалізаваць гэтую незалежнасьць на дзеле—проці волі англійскага пратэктара — жандарма...

Далейшыя перамогі Чанг-Кай-Шэка.

Войскі Чанг-Кай-Шэка, гонючы перад сабой разьбітыя арміі Чанг-Тсо-Ліна, сьпешным маршам пасоўваюцца на Цянь-Дзін. Паўночныя арміі маняцца ўкрапіцца на лініі Галубое ракі, каб бараніць яе за ўсякую цану. У рэзультаце баёў паўдзённыя арміі валадаюць амаль ня ўсёй правінцыяй Шантунг, якая мае вялізарную стратэгічную вагу.

Цікаўны артыкул Бухарына ў „Правде“.

Агульную ўвагу зьвярнуў на сябе цікаўны артыкул Бухарына, які разглядаецца, як паў-афіцыяльная прапазіцыя Чанг-Кай-Шэку вясьці супольную акцыю з Радамі у Кітаі. Бухарын прапануе паўдзённаму Чангу ўстанаўленьне дыпляматычных зносінаў, а навет—помач проці англійскіх імпэрыялістаў, якія падтрымліваюць паўночныя арміі.

Амэрыканскі бюджэт.

Амэрыканскі бюджэт даў надвышку даходаў над выдаткамі ў суме 635 мільёнаў даляраў.

Англія, Японія і Кітай.

Мы паведамлялі ўжо аб тым „паразуменьні“, ці — ваенным саюзе, які рыхтуюць англійскія дыпляматы з Японіяй. Англія пэўна-ж перадусім мае выкарыстаць гэты ўзноўлены саюз з Японіяй—у Кітаі. Асабліва характэрна, што Чанг-Кай-Шэк — быццам па намове Англіі — робіць усё так, каб хутчэй змусіць Японію да ўмяшацельства ў кітайскія справы—чынна, адкрыта, аружна. Да часу ягонага паўнаўладзтва Кантонскі ўрад спрытна выдзяляў **адных англійцаў**, заклікаючы зьнішчожыць перадусім гэтага галоўнага ворага кітайскай незалежнасьці. А цяпер Чанг-Кай-Шэк, мо' запраўды ў нейкім паразуменьні з Англіяй, заклікае да байкоту ў першую чаргу **японцаў ды японскага гандлю** і т. д. Ня кажам ужо аб тым, што яго арміі зьнішчажаюць сілу японскага найміта Чанг-Тсо-Ліна, а праз гэта—фактычную ўладу Японіі ў паўночным Кітаі... Усім гэтым выклікаецца няўхільнае ўмяшацельства Японіі ў кітайскую вайну...

Вось, якія цікаўныя весткі падаюць аб гэтым усіленьні Японіі ў Кітаі англійскія крыніцы.

Японцы ня толькі павялічылі свае гарнізоны ў Манчжурыі, але ўжо рыюць праз увесь край акопы, ведаючы згары, што ім не абмінуць вайны з Кітаем... Бо-ж у Кітаі пачаўся байкот усяго японскага.. Камандзір паўдзённых арміяў востра трэбуе ад японскага ўраду, каб безадкладна забраў з кітайскай тэрыторыі ўсе японскія войскі... Токійскі ўрад — у вялікай трывозе... Англійскія карэспандэнты вельмі хваляць Чанг-Кай-Шэка за яго вострую барацьбу з камунізмам ды радавым уплывам у Ханькоў. У паразуменьні з ген. Фэнгам, які быццам канчаткова сарваў усялякія зносіны з Масквой. Чанг-Кай-Шэк пастанавіў прадаўжаць наступленьне на Пэкін, захапіўшы па дарозе і Ханькоў.

Усё вельмі добра складаецца пакульшто для... Англіі. На бяду толькі проці-працоўная палітыка Чанг-Кай-Шэка дае рэзультаты, якіх не спадзяваўся ані ён, ані яго дарадцы... ў тылу яго пабедных арміяў—у Кантоне, Ніег-По, Хонане і інш.,—пачалі выбухаць работніцкія ды сялянскія паўстаньні — на груньце як-раз тых **сацыяльных** трэбаваньняў працоўных масаў кітайскага народу, якія зусім „скасаваў“—у імя агульна—**нацыянальных** ды палітычных мэтаў вызваленчай барацьбы—Чанг-Кай-Шэк, разарваўшы сувязь з „лявіцай“ Куо-Мін-Тангу.

Мы даўно пісалі аб тым, што пасьледзтвы гэткага штучнага расколу адналітай сацыяльна-нацыянальнай ідэалёгіі кітайскага вызвольнага руху, у выніку здрады ваеннага правадыра гэтага руху, няміноча зьнішчажаць усе вялізарныя здабычы кітайскага народу... Можна было нейкі час думаць, што Чанг-Кай-Шэк зразумеў гэтую сваю абмылку ды паправіўся, зрабіўшы саюз з Ханькоўскім урадам і ген. Фэнгам. Як ведама, гэты саюз адразу даў яму ізноў вялізарныя пасьпехі на фроньце. Але цяпер, відаць, ён пачаў выпаўняць ня кітайскую, але англійскую праграму, дык гэтым ставіць пад небясьпеку ўсе здабытыя дагэтуль рэзультаты барацьбы...

Ці ж ня ясна, што Англія—мо' сыплючы яму грошы — адначасна правакуе гэтага паўдзённага Чанга проці Японіі, а з Японіяй заключае ваенны саюз—проці Кітаю, каб супольнымі сіламі раздушыць усю ваенную сілу вызваляючагася Кітаю?!

Гэнрык Барбюс аб фашызьме.

У сувязі з усё ўзрастаючым наступам фашызму і яго імпэрыялістычнай палітыкі ў цэлым радзе гаспадарстваў, знаёмім чытачоў з паглядамі на фашызм вядомага францускага пісьменьніка і публіцысты Гэнрыка Барбюса, — з яго прамовай, сказанай на судзе ў расправе проці Клэрка і Бэрнарда, яшчэ ў мінулым годзе:

„...Сапраўды дзейнымі сіламі фашызму зьяўляюцца фінансавыя магнаты, якія прапагандыстычнай дзейнасьцю друку, які заўсёды бывае ў руках багатых, імкнуцца скіраваць на шлях рэакцыі незадаволенасьць, ды пакуту сярэдняга і дробнага жыхарства.

Ня так даўно адна вялікая амэрыканская часопісь зьмясьціла гэты зусім правільны артыкул.

„Калі капіталізм заўсёды кіраваў людзкімі зьявішчамі ў большай або меншай меры, то трэба адзначыць, што гэтая моц капіталізму мае сёньня найбольшы ўчынак. А капіталізм г. зн. панаваньне фінансавага зладзейства над усім грамадзкім жыцьцём, ідзе рука ў руку з фашызмам. Ня тайна, што міжнародны фашызм узрос дзякуючы грашовай дапамозе буйнай буржуазіі, цяжкай індустрыі і банкаў. Фашызм узьнікаў з капіталізму, ёсьць яго лёгічным насьледкам, арганічным плодам. Ёсьць найвыжшай, наймацнейшай рэакцыяй, дасягшай найбольшай крайнасьці, рэакцыяй старога парадку проці парадку новага“.

Фашызм мае дзьве мэты. Мэту палітычную, — захапленьне ўлады ў дзяржаве і мэту гаспадарчую,—выкарыстаньне працы. Выкарыстаньне працы зьяўляецца варункам яго істнаваньня. Хоча, згодна шаблённай фразеалёгіі, якую стала ўжывае, дапяць таго, каб магутныя масы вытворцаў, працоўных гораду і вёскі, якія зьяўляюцца ў запраўднасьці асновай і жыцьцёвай сілай грамадзянства,— былі яму падпарадкаваны. Толькі ў нашыя часы пачалі масы расчыняць вочы, пачалі задумывацца над тым нячуваным гвалтам, што тыя, якія б мелі быць усім, зьяўляюцца нічым, што маса працуе, змагаецца, ідзе на вайну, якая вядзецца ў інтарэсах меншасьці і зусім варожа тым, якія працуюць. І таму, што працоўным пачалі расчыняцца вочы, працоўныя пачалі арганізоўвацца, каб процістаўіцца гвалту. У запраўднасьці сацыяльныя адносіны выяўляюцца вось як: стагодзьдзямі істнаваў эксплёатаваны і несьвядомы пралетарыят. Зараз ён робіцца ўсё больш сьвядомым, навучыўся пазнаваць і разумець. Клясавая барацьба ў запраўднасьці істнавала заўсёды, бо была вынікам прыгнечаньня большасьці прывілеяванай меншасьцю. У запраўднасьці была работніцкая кляса аж да сягоньня старанай пераможанай. Але, ня гледзячы на гэта, запраўды вялося змаганьне.

Проці гэтай руйнуючай вайны ставіць арганізаваны пралетарыят парадак, пабудаваны на справядлівым панаваньні працы, на пачуцьці адзінства розных народаў. Клясавая барацьба мусіць павясьці да зьнішчажэньня клясаў — тым, што пралетарыят набудзе перавагі і пераможа. Павядзе да зьнішчажэньня войнаў паміж паасобнымі народамі, бо гэтая перамога пралетарыяту створыць у людзей іншы, глыбейшы, праўдзівейшы і рэальнейшы падзел, чым гэта могуць зрабіць геаграфічныя граніцы, і мацнейшае адзінства, чым гэта могуць зрабіць дыплёматычныя дагаворы.

Мэта фашызму — заўладаньне дзяржаўным апаратам. Яму ідзе аб тое, каб стары бяспраўны парадак быў захаваны і вузка зьвязаны з нацыяналізмам і імпэрыялізмам, ды яшчэ завостраны. Як калісь у мінуўшчыне, хоча яшчэ і цяпер захаваць у грамадзянстве закон вайны і зьнішчажэньня, прынцып найвастрэйшай канкурэнцыі і барацьбу над лёзунгам: „Кожны для сябе“, барацьбу, якая мае вясьціся, як паміж паасобнымі адзінкамі, так і паміж народамі.

Фашызм мае ўсюды аднолькавы характар. Кіруецца ўсюды аднолькавай мэтай прыдушыць вызвольныя імкненьні працоўнага люду. Ня гледзячы на тое, што фашыстаўскія ўгрупаваньні ў розных старонах розьняцца паміж сабой сваімі нацыянальнымі імкненьнямі,—яны захоўваюць узаемна прыяцельскія адносіны і падтрымліваюць адзін другога сваімі аналягічнымі заданьнямі. Надмерныя вымаганьні вэнгерскіх фашыстаў у справе Сяміградзьдзя, ніякім чынам не перашкодзілі румынскім фашыстам аднэй сьцяной бараніць у румынскай прэсе будапэшцкіх фальшывамапэтчыкаў. А скіраваныя проці Францыі абражаючыя выпады Мусоліні не перашкаджаюць францускім фашыстам хваліць Мусоліні і браць яго за прыклад.

Фашызм, залежна ад таго, у якой старане ён працуе, бывае мацнейшы або слабейшы, а ў выніку гэтага больш або менш безагляднаы. У меру свайго запраўднага пасьпеху, карыстаецца дапамогай або прыязным папушчэньнем улады. Выступае ўсюды, прынамся напачатку, з аднолькавай фразай. Ня кажа: „Я фашызм“. Кажа „я старана парадку“, што ёсьць найвыгаднейшай ілжой, якая вядзе за нос народы.

Паўсюды, дзе замацаваўся фашызм, пануе сыстэма бандытызму, варожага работніцкай клясе, — сыстэма забойстваў і гвалтаў, якая трымае ўсіх работнікаў у паняволеньні. На ўласныя вочы бачыў я гвалты, якія пераможны фашызм рабіў у гарадох і вёсках. Перад некалькімі месяцамі я падарожнічаў па Эўрапэйскаму Усходу. Блізка стыкаўся з няшчаснымі народамі Баўгарыі, Румыніі, Вэнгрыі, над якімі пануе белы тэрор і забойствы. Зусім немагчыма падлічыць і пераказаць аб паасобных і групавых забойствах, бяспраўі і мардаваньні засуджаных, аб „змовах“, якія ў запраўднасьці выдуманы, ці знарок выкліканы тымі, што зьяўляецца безадказнымі панамі палажэньня. Немагчыма — бо іх за-надта вялікая лічба. Усе гэтыя зладзействы скіраваны ня толькі проці прыхільнікаў найкрайнейшай лявіцы, але проці ўсіх, якія выказваюць навет найменшы дэмакратызм. На ўласныя вочы бачыў я гэтыя злачынствы, насеньне якіх мае быць пасеяна і ў нас. З балканскага пекла вынес я ўражаньне ганьбы і згрызоты сумленьня. І сёньня першы раз адчуваю нейкае палягчэньне, што магу перад судом паказаць страшны прыклад фашыстаўскага рэжыму“.

ХРОНІКА.

Да справы грамадаўскіх паслоў і дзеячоў. У Віленскіх судовых колах апавядаюць, быццам судовы працэс проці трыманых у Вронках і ў Вільні беларускіх паслоў і іншых грамадаўскіх дзеячоў мае адбыцца ў Вільні ў верасьні або ў кастрычніку с. г. Цяпер распрацоўваецца акт абвінавачаньня, і ад таго, калі ён будзе закончаны, залежыць вызначэньне судовае расправы.

Госьць з Латвіі. Надовячы ў Вільню прыяжджаў госьць з Латвіі — вучыцель беларускае гімназіі (ўрадавае) ў Дзьвінску, грам. Фёдараў.

Грам. Фёдараў даведаўся да галоўных нашых культурных установаў і грамадзкіх арганізацыяў, аглядаў музэй ім. Ів. Луцкевіча і складаў візыты выдатнейшым нашым дзеячом.

Ад госьця нашага мы даведаліся, што праца беларуская ў Латвіі—пасьля цяжкога крызісу, выкліканага, як ведама, скандальным працэсам проці беларускіх культурнікаў (усе яны былі апраўданы),—ідзе ізноў поўным ходам. Назначэньне сацыялістычным урадам Латвіі на становішча кіраўніка беларускага аддзелу ў міністэрстве асьветы грам. Шгулеўскага зразу скранула нашу школьную справу з мёртвага пункту. Беларусам прыходзіцца ўсё ж яшчэ весьці ўпорлівую барацьбу з польскім і расейскім нацыяналізмам і захватніцкімі імкненьнямі.

„Новы Прамень“. З Прагі Чэшскай атрымалі мы № 1 новага беларускага журналу пад назовам „Новы Прамень“. Гэта — часопісь беларускага паступовага студэнцтва. Кніжка на 84 страніцах зьмяшчае багаты матэрыял. Сярод стацей зварачаюць на сябе ўвагу: Сусьветнае „разбраеньне“ М. Віленскага, Палітычнае жыцьцё ў Зах. Беларусі, Аб справаздачы ўраду БСРР на сэсіі Ц.В.К. ССРР, Народная гаспадарка БСРР, Зямельныя адносіны на Беларусі, Сучасны стан Польшчы, Белы тэрор, стацьці аб фашызьме. Даволі багаты аддзел хронікі. Ёсьць і літэратурны аддзел, але ён вельмі слабы: пара вершыкаў, напісаных вязьнямі з „нашых“ Лукішак, ды перакладное з нямецкага апавяданьне пралетарскага пісьменьніка Бэхера. З боку мовы журнал мае шмат заганаў, на што і зварачаем увагу рэдакцыі, вітаючы яе паважнае па зьместу пачынаньне.

Сябра „Камінтэрну“ ў Вільні. „Кур. Віл.“ падае сэнсацыйную вестку аб бытнасьці ў Вільні сябры „Камінтэрну“ Эмы Гольдін.

21 чэрвеня Эма Гольдін, маючы амэрыканскі пашпарт на імя Панафідінай, расейскай арыстакраткі-эмігранткі, затрымалася ў Вільні ў аднэй з найдаражэйшых гасьцініц. Яна ўраз жа завязала сувязь з тутэйшымі расейскімі эмігрантамі, якім заявіла, што прыехала з Амэрыкі дзеля зборкі прадметаў для музэю ахвяр бальшавізму. За паасобныя прадметы будзе плаціць ажно па 50 даляраў. Згаладалыя эмігранты кінуліся шукаць у сваіх архівах патрэбныя рэчы й дакумэнты, а госьця тым часам завяла з прадстаўнікамі манархістаў гутарку аб іх арганізацыях і дзеяльнасьці проці бальшавікоў. Ведама, ей усё ахвотна расказалі, зусім давяраючы паказаным дакумэнтам і рэкамандацыям. Пэўне-ж не абыйшлося і без высьненьня справы забойства радавага пасла... У часе гутаркі госьця заўважыла, што адзін з прысутных манархістаў нешта надта пільна прыглядаецца да яе, як быццам прыпамінаючы, ці яе дзе ня бачыў раней. Баючыся

мне папробаваць папасьці ў люльку гэтага маленькага ката.

Франсуа д'Эманьян ніколі ні ў чым не адмаўляў сваей нарачонай. Ен нядаўна падараваў ёй пэрлавы нашыйнік, які каштаваў трыццаць тысяч франкаў. Ці мог ён адмовіць ёй у гэтай нявіннай сялянскай забаўцы? Ен узяў у жаўнера стрэльбу і падаў яе заручніцы.

Убачыўшы дзяўчыну з стрэльбаю, палонькі падаліся ўзад і стаўпіліся ў другім куце адгароджанае дзялянкі. Толькі Поль спакойна стаяў з люлькаю і ўсьміхаўся. Габрыэля хацела папасьці ў рухаючуюся люльку і, цэлючыся, яна сказала хлопчыку:

— Уцякай-жа! Я буду страляць!..

Але Поль часта бачыў, як людзі стралялі з стрэльбаў, і таму ён далей спакойна стаяў на месцы. Тады Габрыэля з нецярплівасьці выстраліла, і дзеля таго, што яна страляла ўпяршыню, зусім выбачаны яе прамах.

— Мая мілая,—сказаў Франсуа д'Эманьян,—вы куды лепш пражынаеце сэрцы стрэламі, чым гліняныя люлькі кулямі. Глядзеце, вы забілі гэтага гадзёныша, а люлька асталася цэлая.

Габрыэля дэ-Банівэт нічога не адказала. Гледзячы на невялічкую чырвоную плямку, яна часьцей задыхала, і мацней прыціснуўшыся да Франсуа, запрапанавала яна вярнуцца дамоў, адчуваючы, што ёй цяпер неабходны пяшчоты жаніха.

Поль-Ру, які жыў на зямлі чатыры гады і больш за ўсё на сьвеце любіў пускаць з гліняное люлькі мыльныя паўхіры, ляжаў нярухомы.

Нядаўна я спаткаўся ў Брусэлі з старым камунарам П'ерам Лятрэкам. Я падружыўся з ім, і адзінокі стары падараваў мне сваю адзіную ўласнасьць—гліняную люльку, з якое пяцьдзесят гадоў назад маленькі Поль-Ру пускаў мыльныя пузыры. П'ер Лятрэк, у траўнёвы дзень, калі чатырохгадовы паўстанец быў забіты Габрыэляй дэ-Банівэт, знаходзіўся ў загоне Люксэмбурскага Саду. Блізу ўсіх, з лічбы быўшых у ім, вэрсальцы расстралялі. П'ер Лятрэк ацалеў таму, што якіясь франты сьцямілі, што трэба-ж некаму працаваць, і што прыгожаму Парыжу, які захоча быць яшчэ прыгажэйшым, прыпатрэбяцца муляры, цесьлі і кавалі. П'ер Лятрэк быў сасланы на пяць гадоў, ён уцёк з Кайенны ў Бэльгію і праз усе пакуты пранёс люльку, падабраную каля трупа Поля-Ру. Ен даў мне яе і расказаў усё, запісанае мною.

Я часта дакранаюся да яе сухімі ад гневу губамі. У ёй сьлед дыханьня кволага і бязьвіннага, яшчэ, быць можа, сьлед даўно лопнуўшых мыльных паўхіроў. Але гэтая цацка маленькага Поля-Ру, забітага Габрыэляй дэ-Банівэт, найхарашэйшаю з жанчын найпрыгажэйшага з гарадоў, Парыжу, — гаворыць мне аб вялікай ненавісьці. Туляючыся да яе, я малюся аб адным: каб пабачыўшы белы сьцяг, не апусьціць стрэльбы, як гэта зрабіў бедны Луі-Ру, і дзеля ўсяе радасьці жыцьця не аддаць форту сьв. Вінцэнта, на якім яшчэ трымаюцца тры шалёныя кашульнікі і хлопчык, што пускае мыльныя паўхіры.

(Канеп).

быць пазнанай (а яна, як аказваецца, летась таксама была ў Вільні, толькі пад другім прозьвішчам), Эма Гольдін прыпыніла нараду, папрасіўшы прысутных сабрацца цераз колькі гадзін дзеля далейшае гутаркі, сама-ж мамэнтальна зьнікла з гасьцініцы...

Устрывожаны гэтай справай орган польскіх „дэмакратаў“ перасьцерагае расейскіх манархістаў, каб не аднасіліся лішне даверчыва да ўсялякіх нібы-то пасланцоў Мікалая Мікалаевіча.

Першае паседжаньне новае Мястовае Рады ў Вільні мае адбыцца 18 ліпня. На гэтым паседжаньні адбудуцца выбары прэзыдэнта і магістрату.

Падзяка. Урад Бел. Навук. Т-ва выказывае сваю падзяку грам. Астапчыку ў Вільні за ахвяраваныя для музэю ім. Ів. Луцкевіча 6 медных расейскіх манэт, ды 1 сярэбраную і тры папяровыя японскія.

Камунікат.

Прэзыдыуму Белар. Нацыян. Камітэту.

Старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, грам. Ів. Савіцкі, прыслаў у нашу Рэдакцыю наступны камунікат:

1-га і 2-га ліпня па розных беларускіх установах былі разасланы паведамленьні аб скліканьні сходу Беларускага Нацыянальнага Камітэту, падпісаныя двума сябрамі гэтага Камітэту грам. Ярэмічам Ф. і грам. Стэповічам А.—„за прэзыдыум“. У гэтым паведамленьні вызначаны парадак дня, месца і час сходу. Між іншым, прадбачацца перавыбары прэзыдыуму камітэту.

Дзеля таго, што ініцыятыва скліканьня сходу належыць прэзыдыуму, або ініцыятыўнай групе сяброў у паразуменьні з прэзыдыумам Камітэту, а гэтага паразуменьня ня толькі ня было, але ня было навет і папярэджаньня аб скліканьні, прэзыдыум Камітэту лічыць гэты сход не правамоцным, а пастановы яго, калі такія былі зроблены, незаконнымі.

Прэзыдыум Камітэту апрача гэтага адзначае, што подпісы гр. гр. Ярэміча і Стэповіча „за прэзыдыум“ Камітэту носяць рысы праступленьня, якое пры нармальных варунках караецца, як падлог.

Прэзыдыум Бел. Нац. К-ту:
(подпісы).

Беларуская вечарына.

(В. Азіраўцы, Браслаўшчына).

Дзень 19-га чэрвеня сёл. году назаўсёды астанецца памятным дзеля нашае вёскі. У гэты дзень адбылася першая беларуская вечарына, на якой таксама першы раз выступаў наш вясковы беларускі хор. Вельмі добра і прыгожа была адыграна п'еса Аляхновіча „Птушка шчасьця“. Пасьля дэклямацыі, у якой адзначылася Марыня Сіротка, на сцэну выйшаў хор і са сцэны, скалочанай нашымі мазольнымі рукамі, паняслiся зыкі беларускае песьні. Прысутныя так былі захоплены і такое моцнае ўражаньне зрабіла на іх наша родная песьня, што воплескам ня было канца. Навет паўпанкі, якія вельмі коса глядзяць на ўсё беларускае, былі так захоплены, што сваё задаволеньне выказывалі на кожным кроку. Відаць, роднае слова і родная беларуская песьня ўдарыла і іх па сэрцу і ў другі раз яны ўжо ня будуць адгаварываць народ, каб ня ішоў на спэктакль. Шчырае дзякуй нашым маладым артыстам, шчырае дзякуй тым нашым барацьбітам за лепшую будучыну, якія, вярнуўшыся з Лукішскае няволі, з запалам узяліся і наладзілі гэтую вечарыну. Памяць аб іх працы, аб іх ахвярнасьці астанецца ў нашых сэрцах. Ганьба і стыд тым з нашых вяскоўцаў, асабліва сябрам нашага гуртка Т-ва Бел. Школы, якія ня прынялі ўдзелу ў нашай працы і якія навет не зьявіліся на вечарыну і тым самым ня выпаўнілі тых абавязкаў, якія ўзялі на сябе па сваей добрай волі. Калі ня хочаце разам з намі працаваць, выходзьце з гуртка, а ня то мы самы выкінем вас з сваіх радоў, каб вы сваімі паступкамі ня плямілі нашага гуртка.

Стоік.

Чаго варты сельсаюзьнікі.

(Са Стаўпцоў).

Прачыталі мы ў газэтах заметкі аб п. Цяўлоўскім, каторага, відаць, у Баранавіцкім павеце яшчэ ня ўсе добра ведаюць, але за тое мы тут, у Стоўпцах, ведаем яго надта добра. Ніякі з яго беларус, бо ад галавы і да самых ног самы звычайны ён паляк дый яшчэ шовініст! Круціўся ён тут нейкім агентам у радах людовых, у Стражы Крэсовай і у Вітаса. Паходзіць са шляхты, але адукацыі ня мае ніякай. Уперад насіў доўгія вусы, а цяпер ходзіць ужо бяз вусаў, каторыя згаліў, відаць, каб яго Беларусы не пазнавалі, бадай, выгадней яму падавацца за Беларуса. Працуе тайна за адно з „доктарам“ Паўлюкевічам. Шмат крычыць і на ўсякія штукі майстар. Наагул асоба мала інтэлігентная, але з вялікімі прэтэнсіямі. Дык ня дзіва, што ён патрапіў гурткі Белар. Інст. Культуры і гаспадаркі падабраць у свае рукі, паказваючы гэтым „палітычную дулю“ правадырам ярэмічава-рагуляўскага Сельсаюзу, уплывы каторых з вёсак і гарадоў зьніклі, як камфора, калі наагул дзе калі й былі.

Аднак, як відаць, п. Цяўлоўскі добра падыйшоў да сельсаюзьніцкіх гурткоў, бо яны яго сьведама ці несьведама бароняць, хаця ўсе дзеячы цураюцца яго, як агня, дый некатарыя нат' баяцца... Ляпей не чапаць!...

Дык сельсаюзьнікаў—вітаем!... А вось, хлапцы, асьцярагайцеся асобы пад маскай...

Серада.

Ад рэдакцыі. Зьмяшчаючы гэту карэспандэнцыю, мусім адзначыць, што ў № 17 „Бел. Дня“, выдаванага палякмі ў беларускай мове, п. Цяўлоўскі у сваім адкрытым пісьме публічна прызнаецца, што **пашырае ідэі „Беларускага Дня“**. Лепшае рэкамандацыі хіба **ня трэба!**

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрые разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Да апошніх арыштаў сярод беларусаў.

Што апавядаюць пацярпеўшыя.

Як мы падалі ў папярэднім нумары, заарыштаваныя бяз дай прычыны на час віленскіх урачыстасьцяў беларускія культурныя працаўнікі, звольнены ўсе ў мінулы панядзелак. Ад іх наша Рэдакцыя даведалася аб гэным арышце наступнае.

Арыштаваныя проста не знаходзяць слоў, каб высказаць сваё абурэньне з прычыны пэражытага імі гвалту—і зьдзеку, ды маны некаторых органаў польскае прэсы, пісаўшых, пэўне-ж, тое, чаго хацелі вінавайцы беспадстаўных арыштаў.

Мінаючы абвіненьне ў прыналежнасьці заарыштаваных да камуністычнае партыі ці то да няістнуючай Грамады, бо мана „Слова“ і „Кур. Пор.“ відавочна для ўсіх, хто хоць трошкі знаёмы з беларускім жыцьцём, заарыштаваныя адзначаюць і цэлы рад брахлівых падробнасьцяў арыштаў.

Падробнасьці арыштаў.

Гр. В. Грышкевіч і І. Дварчанін заарыштаваны зусім ня ў рэдакцыі „Маланкі“, а кожны на сваей кватэры, і то не ў адзін і той самы час. Гр. В. Грышкевіч заарыштаваны ў ноч з 30 чэрвеня на 1 ліпеня, грам. Дварчанін — ужо пасьля ўсіх другіх арыштаў, у 2 гадзіны дня 1 ліпня, у той час, як г. Я. Маразовіч забраны яшчэ каля 10 гадзіны вечара 30 чэрвеня і таксама зусім не ў памяшчэньні рэдакцыі „Маланкі“. Рэшта заарыштаваных забрана разам з г. Маразовічам.

„Кампрамітуючыя матэрыялы“.

Цяпер што да „kompramitującego materjału“. Тут трошкі гумару. У гр. Дварчаніна, напр., узялі вершы М. Багдановіча, гатаваныя для праектаванага зборніка; новы зборнічак вершаў Г. Леўчыка „Беларускі жаўранак“, прысланы для выбару з яго матарыялу да хрыстаматыі; некалькі лістоў прыватнага характару, дзе гаворыцца выключна аб справах выданьняў; урэшце—фатаграфіі прыватных знаёмых яго. Узяты такжа два нумары часап. „Беларуская школа ў Латвіі“. Вось і ўвесь „kompromitujący materjał“. У гр. А. Рутkоўскага на кватэры без ягонае прысутнасьці *) забралі чыста інтымную перапіску. Бедныя паненкі і ня думалі пэўна, што іх лісты ды фатаграфіі апынуцца ў такіх цікавых руках!

Ня будзем выцягваць далейшы матарыял, каб ня было запраўды „цяжка“ чытачу.

Сярод крыміналістаў.

Усіх заарыштаваных павялі на Ігнатаўскі завулак, дзе зьмясьцілі разам з крыміналістамі ў „цэлях“ па 25—30 чалавек. Духата, смурод — немагчымыя. Ад гутарак ды „гумару“ сабраных тут з усяго места зладзеяў—проста хоць вушы затыкай. А прадстаўленьняў бясплатных! — хопіць уражаньняў на цэлае жыцьцё.

Па правілу належыцца на Ігнатаўскім завулку дзяржаць ня болей, як 24 гадзіны, пасьля чаго чалавека або звальняюць, або, прадставіўшы абвіненьні, пераводзяць у якую-небудзь сталую турму. Нічога гэтага ня было зроблена з беларускімі дзеячамі. Заарыштаваныя прасядзелі „ўпрыемнай кумпаніі“ блізка чатыры дні, ня ведаючы ў чым іх віна і што з імі будзе далей. Спаць прыходзілася на голых нарах і так цесна адзін пры адным, як селядцы ў бочцы. Ад паветра паразбаліваліся галовы, а спацыру, ня гледзячы ні на просьбы, ні на трэбаваньні,— не давалі. Навет неабходнага выхаду на двор часамі прыходзілася прасіць па некалькі гадзін.

Як кармілі.

Есьці давалі прыблізна па фунту хлеба ў дзень на чалавека ды „кавы“ патрошку рана й вечарам. Іншае яды навет і не паказвалі. Купіць за ўласныя грошы можна было толькі пасьля раду ўніжэньняў. Без гарачае стравы на другі—трэці дзень амаль у-ва ўсіх пачало рэзаць у жываце. Фізычныя болі пачалі перавышаць духовыя. Пратэсты і абурэньні вылiваліся проста „з нутра“.

Асаблівы дапрос.

А дапрос таксама быў падобны на якуюсьці камэдыю. Выглядала, што кожны дапрашваўся ў характары сьведкі. „Czy zna pan takiego i takiego“?, якія адносіны між тым і тым ці тою, якіх беларускіх дам і паненак ведаеце (?!), што Вам гаворыць „чын“ Кавэрды, ці не гаварылі часам хто са знаёмых аб ім што-небудзь (пэўна-ж аб такім „гэроі“ мала хто гаварыў добрае!), ці не натхнуў каго гэты „чын“ на падобнае дзела (так, „натхнуў“... агідай!). Вось і ўсе пытаньні „badania“.

Запраўдная прычына так і асталася „w tajemnicy“. Не сказалі аб ёй навет выпускаючы. „Kompromitujące materjały“ ўсе зьвернены, апроч некалькіх невядомых нам паперак гр. Я. Мамонькі. Трэба было б іх усе здаць у музэй для калішніх гістарычных дасьледаў і гумарыстычных ілюстрацыяў.

Было і біцьцё!

Не абыйшлося і бяз „сур'ёзных“ рэчаў. Гр. Л. Мэнку, вядучы з дапросу да „celi“, паліцыянт № 1708 пачаў штурхаць у плечы. На пратэст гр. Мэнкі „нумэр“ пабольшыў порцыю і, калі гр. Мэнка пачаў крычаць, „нумэр“ заткнуў яму рот, ды ў камэры даходзіў галас чалавека, якога душаць. Урэшце моцным штурхачом „нумэра“ гр. Мэнке быў упхнёны ў камэру. Бойку і крык, як і факт „далікатных“ уводзінаў у камэру, бачылі і чулі амаль усе заарыштаваныя. На запытаньні сяброў з іншых камэраў, „нумэр“ адказаў, што крычыць якісь вар'ят, ці п'яны— (гэта ўжо пасьля 10 гадзіннае бытнасьці пад арыштам, дык хіба ўпіўся „сьвежым“ паветрам)!

Гр. Мэнке ўраз павыхадзе пачынае судовую справу за гэта.

Усе заарыштаваныя з абурэньнем пратэстуюць проці нічым неапраўданых зьдзекаў і гвалтаў. Ад перамены паветра амаль усе, па звальненьні, адхварэлі.

---

*) Вобыск бяз прысутнасьці абвінавачаных адбыўся і ў гр. гр. Шылы і Маразовіча.

Карэспандэнцыі.

Добры прыклад.

(В. Івашкавічы, Ваўкавыскага пав.).

Хаця грамаду і зьліквідавалі, але таго духу і тых прынцыпаў, якія несла грамада на сваіх сьцягах, ніякія сілы ня здоляюць зламаць той прамень сьвятла, які ўнесла грамада ў нашае гаротнае жыцьцё, сьвеціць нам і цяпер і ўлівае ў нас надзею на лепшую будучыну. За прыкладам далёка ня трэба ісьці. У сакавіку г. г. узялі ў войска Янку Войтка, які пакінуў бяз хаты і сродкаў да жыцьця дзьве сястры Марылю 18 гадоў і Вольгу 15 гадоў. Вёска адразу заапекавалася імі. А калі падышла пара сеяць, то ўзгаралі і засеялі іхнія шнуркі, на якіх красуе ўжо жытца. Чэсьць і слава тым грамадзянам, якія выпаўнілі свой грамадзкі абавязак і якія сваім добрым прыкладам улілі ў душы маладых сіротаў перакананьне, што ў грамадзе не прападзеш, што „грамада—вялікі чалавек“, што грамада ўсё зможа.

М. Войтка.

Усячына.

— У Бразіліі, недалёка ад гораду Курытывы, выбухнулі лясныя пажары. Выгнаныя агнём з гушчаў лесу ядавітыя вужакі напалі на горад. Змагацца з імі, прышлося выклікаць войска.

— У нью ёрскі зоалёгічны сад прывезьлі з Малайскіх выспаў (у Ціхім акіяне) аграмадную яшчарку, даўжынёй у 3 мэтры. Вучоныя лічаць, што гэта яшчарка паходзіць ад дыназаўра, які даўно вымер.

— У Эгіпце знойдзена новая магіла эгіпецкіх цароў (фараонаў), якія жылі каля 4.800 год таму назад. Магіла мае шмат падземных ходаў.

— У Нямеччыне па заказу аднэй амэрыканскай фірмы зроблены самы магутны ў сьвеце генэратар (электрычная машына). Для працы генэратара будзе паліцца 200.000 пудоў вугальля ў суткі.

— На вучэбных палётах у Англіі начаў валіцца аэраплян. Лятун Грэйк на вышыні 2-х вёрст выскачыў з аэрапляна на парашуце (апарат накшталт парасона) і ўдачна спусьціўся. Аэраплян разьбіўся дашчэнту.

— Міжнародная канфэрэнцыя па авіяцыйных справах, якая адбылася ў Лёндане, пастанавіла дапусьціць жанчын да кіраваньня пасажырскімі аэраплянамі.

— У Англіі ў дачных мясцовасьцях пачалі будаваць летнія хаткі ў адзін пакой, які можа круціцца на восі так, каб быць увесь час павернутым да сонца.

— У Ніжнім Паволжы, у Кузьнецкім павеце, Саратаўскай губ., у часе раскопак знойдзены рэшткі старадаўнага фінскага гарадзішча. Гэта даказвае, што там жылі фіны яшчэ ў VII веку.

Ніколі не зьнішчажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.